# Памятный мемарыяльны знак у гонар воінаў Чырвонай Арміі, якія ў канцы чэрвеня 1941 года вялі баі за пераправу праз раку Зальвянка супраць наступаючых фашысцкіх войскаў



Гэты памятны знак устаноўлены ў 1986 годзе недалека ад берага Зальвянкі. Праект Юркевіча Віктара Міхайлавіча. Тут з 25 па 28 чэрвеня 1941 года шлі жорсткія баі пры фарсіраванні ракі байцамі і камандзірамі акружанай ворагам 10-ай арміі пад камандаваннем генерала Карбышава і палкоўніка Смалякова.

Як вядома, адна з вуліц нашага паселка носіць імя Карбышава. Ен быў генерал-лейтэнантам інжынерных войск, доктарам ваенных навук, прафесарам, выкладаў у ваеннай акадэміі. Перад пачаткам вайны Карбышаў быў накіраваны ў камандзіроўку ў раены нашай заходняй мяжы для аказання дапамогі ва ўмацаванні рубяжоў. У пачатку вайны ранены і кантужаны Карбышаў быў захоплены ў палон. Фашысцкія ўлады хацелі схіліць генерала на свой бок і, атрымаўшы адказ, памясцілі яго ў канцэнтрацыйны лагер Маўтхаўзен. Тут зімой, у лютым 1945 года, фашысты вывелі Карбышава на лагерны двор, разделі і замарозілі, абліваючы халоднай вадой. Пакутлівую смерць прыняў генерал, але застаўся верны сваей Радзіме.



**Адрас: Гродзенская вобласць, Зэльвенскі раён, г.п. Зэльва, 1986 г.**

## Бібліяграфія:


1. Маўклівые сведкі ваеннай пары: краязнаўчы інтэрнэт-праект [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://moygorod-zelva.jimdo.com/. — Дата обращения: 11.04.2019.

2. Мемориалы и памятники, скульптуры и ландшафтные композиции Зельвенского района [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://turismplus.ru/memorialyi-i-pamyatniki-skulpturyi-i-landshaftnyie-kompozitsii-zelvenskogo-rayona.htm. — Дата обращения: 11.04.2019

3. Памятники и мемориалы | Гродненская область. Беларусь. Часть 1 [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://wwii.space/памятники-и-мемориалы-гродненская-об/4/. — Дата обращения: 11.04.2019.

4. Помнікі і брацкія магілы ахвярам фашызму на Зэльвеншчыне [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://pomnikizelva.blogspot.com/p/blog-page_32.html. — Дата обращения: 11.04.2019.

5. Хільмановіч, В. А. Памяць, увекавечаная ў помніках і абелісках / Вольга Хільмановіч // Славуты Зэльвенскі край: матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі “Старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (Зэльва, 12 снеж. 1998 г.) / Рэдкал.: Д. С. Аляшкевіч (гал. рэд.) і інш. — Ліда: ГАУПП “Лідская друкарня”, 2004. — С.167—173; 244.